№6 ЛІПЕНЬ 2008

# Настаўнік.info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

# РОДНАМОЎНАЕ НАВУЧАННЕ:
## стан, нацыянальная бяспека і псеўдарэфарматарства



*Алесь ЛОЗКА, старшыня РГА "Таварыства беларускай школы"*

Стан беларускамоўнага навучання ў адукацыйных установах даўно выклікае трывогу шырокай грамадскасці. Калі ў 1993-94 навучальным годзе бацькі без праблем прыводзілі сваіх дзяцей у першыя класы з беларускай мовай навучання (76% ад усіх першакласнікаў, а ў сталічнай вобласці 92,6%), то цяпер створаны такія ўмовы, што гэтая планка стала ніжэй 18% (нават гэтую статыстыку і сапраўдную сутнасць міністэрства хавае ад народа). На сайце Міністэрства адукацыі (www.minebu.un-ibel.by) вы толькі знойдзеце статыстыку трохгадовай даўніны (за 2005/2006 нав. год). Усяго на беларускай мове сёлета навучалася 20,9% ад агульнай колькасці (гл. табліцу). Гэта даволі крытычныя межы існавання нацыі. Па вызначэнні ЮНЕСКО, народ знаходзіцца на мяжы знікнення, калі на роднай мове размаўляе менш 30% дзяцей. Не цяжка падлічыць, што з такой хуткасцю (прыблізна 1% ў год) поўнае знішчэнне беларускай адукацыі адбудзецца праз дваццаць гадоў. Гэтага нельга дапусціць!

Не лепшыя справы і ў дашкольным выхаванні. Хоць у Міністэрстве адукацыі нам далі звесткі, што на пачатак 2007 года ў краіне 41,3% груп дашкольных устаноў поўнасцю вядуць працу з дзецьмі на беларускай мове, а ў сельскай мясцовасці нават – 77,4%. Мы ж ведаем якасць той працы, калі ў садках поўнасцю не захоўваецца роднамоўны рэжым, як і ў школах. У краіне, якая нібы ўзяла курс на незалежнасць і суверэнітэт, адсутнічае сістэма вышэйшай школы на нацыянальнай мове.

У прадчуванні набліжэння нацыянальнай небяспекі ў народзе больш выразна сталі праяўляцца нацыянальныя пачуцці і пратэстныя ўчынкі, асабліва ў моладзі. Штогод павялічваецца колькасць жадаючых здаваць тэсты па беларускай мове (87 000 абітурыентаў) у той час, як колькасць выпускнікоў школ з беларускай мовай навучання памяншаецца (каля 20 000 у мінулым годзе). Сёлета ўжо гэтыя паказчыкі крыху паменшаны (недзе на 3%). Але затое, тэсты па-беларуску здалі лепш, чым па-руску, кожны трэці іспыт па рускай мове завалены (набрана менш 20%). Па гісторыі на беларускай мове праходзіла тэставанне ў тым жа 2007 годзе 27 490 чалавек з 37 717 абітурыентаў, сёлета – 22 тысячы з 28 479. А тут адсоткі абітурыентаў, якія абралі іспыты на роднай мове, значна ўзраслі (недзе на 4%). І гэта нягледзячы на тое, што Міністэрствам адукацыі быў зроблены нашумелы перавод выкладання гісторыі і геаграфіі на рускую мову. Насуперак адміністрацыйнаму ціску, самавольству і неспрыяльным умовам працягваецца набор у першыя беларускамоўныя класы. І ўсіх жадаючых вучыцца на роднай мове дзяржаўныя школы не задавальняюць, а для вольнага адкрыцця недзяржаўных не створаны спрыяльныя ўмовы. Непераадольным бар'ерам для многіх бацькоў з'яўляецца патрабаванне стварэння паўнавартаснага класа (колькаснае напаўненне).

Прааналізаваўшы працу адукацыйных ўстаноў апошняга дзесяцігоддзя, неабходна канстатаваць аб паніжэнні ў цэлым росту прафесіяналізму, пачуцця нацыянальнага гонару і наогул маральнасці калектываў самога Міністэрства адукацыі і яго ўпраўленняў, арганізацый і ўстаноў, значным прыніжэнні катэгорый каштоўнасцяў і дзелавітасці па захаванні нацыянальнай бяспекі ў галіне адукацыі, аб'яднання педагагічных калектываў, навучэнцкай моладзі і вучняў дзеля адстойвання прынцыпаў незалежнасці дзяржавы. Многія чыноўнікі поўнасцю страцілі імунітэт на нацыянальную бяспеку. Яны зусім не разумеюць, што гэта такое, для чаго яно, або падмяняюць паняцце самі ведаеце якімі "понятиями". *(Працяг на стар. 2-3)*

*Рэформа адукацыі*

## Адбыўся круглы стол "Рэформа адукацыі: пагрозы і перспектывы"

Калі указ пра рэформу адукацыі быў яшчэ не падпісаны, маючыя адбыцца змены, якія чакаюць сярэднюю адукацыю неаднаразова агучваліся. Прапануем вашай увазе тэзы, якія прагучалі падчас абмеркавання апошняй рэформы на круглым стале навукоўцаў і настаўнікаў 27 чэрвеня 2008 г.

**Пра сучасныя тэндэнцыі**

- Свет ператварыўся са свету ідэй у свет інтарэсаў.Тую канцэпцыю (гуманізацыя адукацыі), якую пачыналі ў 90-х гадах, цяпер паўтараць не варта, толькі частку трэба рэлізоўваць зараз.
- З'явіліся новыя магчымасці, кнігарні і Інтэрнэт. Доступ да ведаў неабмежаваны.
- Адукацыя стала "мазаікай, якая дае палітру". Рынак працы патрабуе вузкіх заглыбленых спецыялістаў. Усё раней пачынаецца профільнае навучанне з улікам здольнасцяў вучня і рынку працы. Выпускнік СШ, студэнт, магістрант, доктар - гэта набор кампетэнтнасцяў адпаведнага ўзроўню.

**Пра цяперашнюю рэформу**

**-** Слушна ўзнятыя праблемы адукацыі, але іх трэба вырашаць іншымі метадамі. Залішняя акадэмічнасць школьных ведаў і слабая арыентаванасць на практыку прыводзіць да перанасычэння вытворчасці, *(Працяг на стар. 3)*

**ТЭМА НУМАРА: РЭФОРМА СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ >>> СТАР. 1 - 3**

**АБВЕСТКІ, КОНКУРСЫ, ПРАГРАМЫ >>> СТАР. 4**

# РОДНАМОЎНАЕ НАВУЧАННЕ:
## стан, нацыянальная бяспека і псеўдарэфарматарства

(Пачатак на стар. 1)

Асабліва апошнія 12 гадоў вызначаюцца нестабільнасцю функцыянавання ўстаноў адукацыі. Часта змяняліся вучэбныя планы, праграмы, падручнікі, правілы прыёма ў ВНУ, зачыняліся не горшыя школы, ліцэі і ВНУ. Гэты перыяд у цэлым можна характарызаваць некалькімі трывожнымі "не": нестабільнасць, некампетэнтнасць, непрафесіяналізм, непрадказальнасць, небяспека...

Калі на пачатку падставай зменаў дапаможнікаў магла быць наяўнасць у іх гістарычнага сімвалу, як, напрыклад, у "Буквары" ў 1996 годзе, то цяпер ужо дайшла чарга да выключэння з праграмаў твораў таленавітых, нават народных, пісьменнікаў, скасавання прадметаў, неапраўданага злучэння ў адзін, ці значнага скарачэння гадзін на іх вывучэнне. Прадузятаму рэфармаванню найперш падвяргаюцца дысцыпліны , якія фармуюць грамадзянскія пачуцці, еўрапейскім стандартам беларускай адукацыі і жорсткага ідэалагаічнага ўціску. Тысячы прафесіяналаў збягаюць на працу за мяжу, моладзевая эміграцыя набыла самыя маштабныя памеры, павялічваецца колькасць пасяховых студэнтаў, якія выключаюцца з універсітэтаў за "акадэмічную непасяховасць" (?) ці "за пропускі заняткаў".

У абарону прафесіяналізму і педагагічнай кампетэнтнасці адкрыта выступілі настаўнікі-пераможцы рэспубліканскіх конкурсаў розных гадоў, былыя работнікі Міністэрства адукацыі. Прызнаныя, найбольш свядомыя і знаныя ў гэтай сферы спецыялісты ўсё разумеюць, але многія з іх баяцца з-за рэпрэсіяў выказвацца.Захвалявалявася бацькоўская грамадскасць. Пакуль не праяўляюць грамадзянскай актыўнасці музыкі, сусветнай і айчыннай культуры, але і замежных моў, матэматыкі, фізікі, біялогіі, хіміі. Яны ж у асноўным складалі профілі і спецкурсы, якія цяпер становяцца непатрэбнымі дзеля дзіўнага прынцыпу "ўраўнілаўкі" ў адукацыі. А на пачатку яшчэ ж выказвалася думка пра выкідванне з вучэбных планаў геаграфіі.

Планы і дзейнасць устаноў сістэмы адукацыі не адпавядаюць нацыянальным інтарэсам, часцей іх змест скіраваны на дэкларатыўнасць і павярхоўнасць, не закранаючы глыбіннай сутнасці вырашэння надзённых праблем нацыянальнай адукацыі, выхавання сапраўдных грамадзянскіх пачуццяў, не вызначаецца сістэмнасцю і паслядоўнасцю. У прыватнасці:

- Не забяспечаны належны кантроль за для эканоміі сродкаў.
- Штогод асабліва ў педагагічных ВНУ зніжаецца планавая колькасць прыёму абітурыентаў (сёлета ў БДПУ – больш за 400).
- Паўсюдна не выконваецца пастанова Міністэрства адукацыі ад 27 жніўня 2002 г. №48 "Праграма дадатковых мер па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі"; не праводзілася справаздач аб яе выкананні.
- Безтакіхдысцыплін, як "Беларусазнаўства", "Гісторыя Беларусі", "Беларуская мова", "Беларуская літаратура", "Айчынная і сусветная мастацкая культура", якія церпяць ад непрадуманых рэформ, немагчыма існаванне незалежнай Беларусі. За названыя дысцыпліны нам неабходна змагацца.
- Штогод у сістэме Міністэрства адукацыі

| Вобласць | 94\95 | 95\96 | 96\97 | 97\98 | 98\99 | 99\00 | 00\01 | 01\02 | 02\03 | 03\04 | 04\05 | 05\06 | 06\07 | 07\08 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Мінск | 21 | 17,7 | 15,4 | 13,4 | 11,2 | 9,5 | 8,4 | 7,3 | 6,4 | 5,1 | 4,2 | 3,6 | 3,2 | 4994 | 2,5 |
| Брэсцкая | 44 | 39,2 | 35,7 | 33,4 | 32 | 30,7 | 30,2 | 28,8 | 27,6 | 26,9 | 26,4 | ***28,5*** | 25,9 | 47859 | 25,8 |
| Віцебская | 35,9 | 28,5 | 26,9 | 26,2 | 25,2 | 25,9 | 24,5 | 23,8 | 23 | ***23,1*** | 21,5 | 21 | 20,6 | 27431 | 19,8 |
| Гомельская | 43,4 | 26,1 | 23,3 | 21,9 | 20,7 | 20,4 | 20,3 | 19,8 | 18,9 | 18,4 | ***18,6*** | 17,3 | 16,9 | 29817 | ***17*** |
| Гродзенская | 50,7 | 50,8 | 51,3 | 51,5 | 51 | 50,3 | 48,3 | 45,9 | 41,9 | 38,1 | 35,2 | 31,9 | 29,2 | 36837 | 27,6 |
| Мінская | 54,6 | 55,3 | 55,8 | 54,5 | 54,4 | 54 | 52,6 | 50,8 | 47,9 | 44,5 | 42,6 | ***43*** | 37,6 | 60806 | 36,4 |
| Магілёўская | 34,6 | 27,5 | 23,8 | 22,6 | 22,1 | 22,9 | 21,6 | 21 | 20,8 | 19,9 | ***20,5*** | 18,8 | 18,5 | 23427 | 17,9 |
| ***Усяго*** | **29,4** | **27,8** | **32,9** | **31,6** | **30,5** | **30** | **29** | **27,8** | **26,3** | **24,8** | **23,8** | ***23,3*** | **21,5** | | ***20,9*** |

**Табліца размеркавання вучняў (% ад агульнай колькасці), якія займаліся па-беларуску ў школах (1994-2008)**

маральныя якасці. Гэта вынік грэблівых адносін да роднай мовы (адной з дзяржаўных!) і нацыянальнай культуры, нізкі кадравы падбор на кіруючыя пасады. Нават дзяржаўная "цэнзура" СМІ прапускае недаравальныя "ляпы" высокіх чыноўнікаў, якія дзівяць і смешаць народ, натхняюць на стварэнне "шматтомных" выданняў цытатнікаў і г.д. Выратоўвае яшчэ тое, што існуе негалосная забарона на вялікія выступы па тэлебачанні і радыё міністраў і іншых чыноўнікаў.

Пра глыбокі крызіс у адукацыйнай сферы сведчаць факты неадпаведнасці запалоханыя педагогі і кіраўнікі адукацыяй, якія ў сваёй большасці ўсё-такі разумеюць вартасць еўрапейскага выбару і нікчэмнасць сучасных скараспелых псеўдарэформ. Некаторых нават не палохае будучае вялікае скарачэнне. А гэта ж не тыя 20-30 тысяч педагогаў згубяць працу, што называліся ў прэсе. Пойдзе ланцужковае скарачэнне нават факультэтаў у ВНУ, педкадраў у інстытутах павышэння кваліфікацыі і г.д. Рэзкай незапатрабаванасці ў адукацыі набудуць не толькі абвешчаныя "рэпрэсіямі" спецыяльнасці беларускай мовы і літаратуры, гісторыі, выкананнем дзяржаўнымі ўстановамі артыкулаў 17 і 50 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (права на выкарыстанне беларускай мовы).

- Не забяспечваецца дастатковае фінансаванне устаноў адукацыі згодна закона "Аб агульнай сярэдняй адукацыі" (у Мінску дашкольныя ўстановы і школы перапоўнены, не ўсюды ўтрымліваецца прынятая норма напаўняльнасці класаў і груп, не справядліва зм'яншаюцца тэрміны адпачынкаў асабліва работнікаў дашкольных устаноў); адукацыя па ранейшаму застаецца галіной закрываецца больш ста школ з беларускай мовай навучання, вучні якіх пераводзяцца ў рускамоўныя ўстановы; не праводзяцца рэальныя захады па стварэнні прэстыжу роднай мовы ў грамадстве, падтрымцы нацыянальна свядомага настаўніцтва.
- Многія кіраўнікі, выкарыстоўваючы адміністрацыйны рэсурс, ідуць на адкрыццё ў і без таго малалікіх беларускамоўных школах класаў з рускай мовай выкладання, якія паступова выцясняюць першыя (сёлета, напрыклад, насуперак усяму ў разрад двухмоўных устаноў пераведзена адзіная гарадская

ў Віцебскай вобласці СШ № 3 г. Глыбокага; у Мінску яшчэ раней – СШ № 190 і інш.).

• Не забяспечаны ўмовы на права выбару мовы навучання ва ўніверсітэце, роднамоўная пераемнасць паміж школай і сярэднімі спецыяльнымі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі; у ВНУ на самой справе адсутнічаюць беларускамоўныя плыні, а яны прапісаны ў законе "Аб вышэйшай адукацыі" (22 арт.).

• Не ў поўнай меры працуюць на незалежнасць Беларусі рускамоўныя радыё, тэлебачанне, газеты і часопісы, кнігавыдавецтвы, адміністрацыйныя ўстановы.

• Не надаецца належнай увагі ў адукацыйных установах выхаванню агульначалавечых нормаў, у людскім абыходзе не выкаранена яшчэ з царскага часу шавіністычная выдумка, што беларуская мова – "нацыяналістычная". Ды што тут разважаць, калі з самых высокіх трыбун без цені сумнення заяўляецца: "Мы с этим (нацыяналізмам – А.Л.) бороться начали давно. Из школьных программ по моей инициативе были убраны все националисты, так называемые писатели".

• Маральны клімат адукацыйных устаноў даўно жадае паляпшэння: без зменаў кардынальнай сістэмы грамадскіх адносін у краіне рэпрэсіўныя меры не прыносяць належнага стану, выкаранення карупцыі, прыпісак, крадзяжоў і нават маральнай разбэшчанасці. Гэтаму спрыяе чыноўніцкая ўседазволенасць, крывадушша, пазбяганне праблемнасці і праўдзівасці ў СМІ. Суды штампуюць абвінавачванні прадстанікам грамадскай інтэлігенцыі за ... "ругательства", "избиения милиции", патрабаванні бланка на роднай мове і г.д.).

• Дабіваючыся справядлівасці, нацыянальнай годнасці ўпершыню навучэнцкая моладзь вымушана была прымяняць галадоўкі.

• Пратэстная плынь супраць знішчэння роднай мовы, нацыянальнай асветы вынесла ў вір барацьбы нават школьнікаў, як сведчаць затрыманні і суды апошняга часу.

• Рэзка павысілася колькасць палітычна матываваных выключэнняў з універсітэтаў як выкладчыкаў, так і студэнтаў (дайшло да таго, што выдатнікаў вучобы выключаюць за акадэмічную непаспяховасць і іншыя надуманыя матывы, як гэта здарылася з Таццянай Хомай – БДЭУ, Юрасём Алейнікам – Акадэмія кіравання, Дзмітрыем Жалезнічэнкам – ГДУ і інш.). У гэты не малы шэраг трэба аднесці Франака Вячорку, Антона Каліноўскага і іншых.

• Не знаходзячы рэалізацыі сваім памкненням у Беларусі, моладзь з'язджае вучыцца ці працаваць за мяжу (тут дапамогуць не сілавыя і запалохваючыя меры, а стварэнне еўрапейскіх умоў на радзіме).

• Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, якая не далучылася да Балонскага працэсу (вышэйшая адукацыя не адпавядае агульна-прынятым нормам, а цяпер яшчэ і сярэдняя адукацыя адкідваецца ў мінулы савецкі тупік).

• З адменай ільготаў, пачынаючы з малодшага школьнага ўзросту, значна панізілася матэрыяльная забяспечанасць і дабрабыт сем'яў. Адчуваецца недахоп інтэрнатаў для студэнтаў.

• Прыняцце Закона "Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" выглядае паспешным, несвоечасовым, без папярэдняга шырокага абмеркавання спецыялістамі ў СМІ і навуковых канферэнцыях.

• Падвяргаюцца прадузятаму, тэндэнцыйнаму, рэвізаванню праграмы і падручнікі (творы класікаў, народных пісьменнікаў, агульнапрызнаных майстроў замяняюцца менш значнымі, а то і нізкапробнымі пісаннямі).

• Тэрмінова неабходна адмянць ганебнае і дыскрымінацыйнае нова-ўвядзенне – папярэдні допуск да іспытаў паступаючых на журналісцкія, праваназнаўчыя і іншыя спецыяльнасці. Мы ўпэўнены, што яго прайшлі б у свой час асуджаныя высокія чыноўнікі Рыбакоў, Жураўкова, Холад і інш.

• Педагагічныя, студэнцкія і вучнёўскія калектывы адукацыйных устаноў усіх формаў, бацькоўская грамадскасць стаміліся ад частых зменаў навучальных планаў, праграм, падручнікаў і правілаў прыёму. Не скончыўшы як след адну рэформу, у якую ўклалі вялікія народныя рэсурсы, пачынаюць паспешна іншую, не скіраваную ні на еўрапейскі досвед, ні на падтрымку беларускай ідэнтычнасці, нібы даючы прастор у бліжэйшы час для чарговых затратных зменаў. Дзейнічаем па прынцыпу народнай прымаўкі: «Акуля, што шыеш не адтуля, а я,матушка, яшчэ пароць буду». Так, адукацыя не дасягнула, каб першы клас вывучаў грамату ў гульнявой форме, каб 11 і 12 класы сталі профільнымі, у якіх навучаюцца тыя, хто будзе паступаць на вызначаную спецыяльнасць. Непрадуманым крокам назад неабходна лічыць скасаванне ўжо названых важнейшых у станаўленні грамадзянскасці дысцыплін і скарачэнне на іх вывучэнне колькасці гадзін, адмена профільнага і паглыбленага навучання, прыніжэння ролі гімназій і ліцэяў. Чалавек ад нараджэння ўжо мае неаднолькавыя магчымасці, здольнасці, таму і прынцып пад "адзін капыл" непрыдатны. Гэта – педагагічная ісціна, і справы, звязаныя з навучаннем і выхаваннем, павінны вырашаць прафесіяналы.

У складзеных варунках было б лепш пакінуць рэфармаванне на будучыню. Заява пра вартасць і эканомію ў скарачэнні 12-гадовага навучання разлічана на простага абываценя, які паддаецца на часовыя эмацыянальныя ўплывы, неразборлівага ў спецыфічных тонкасцях справы.

Адразу зразумелі небяспеку тыя бацькі, якія першымі адчулі хваляванне за лёс сваіх дзяцей з-за наступнага падвоенага выпуску. А колькі патрэбна новых падручнікаў, планаў! За адно лета, паспешна, калі педагогі пайшлі ўжо ў адпачынкі, такую рэформу якасна зрабіць немагчыма.

У апошнія гады не папулярная пазіцыя Міністэрства адукацыі адносна беларускай мовы і культуры, яго рэальныя крокі (нават тое, што міністр не карыстаецца адной з дзяржаўных моў), непрадуманая мітусня ад ад-наго кроку да супрацьлеглага, гаворыць аб адсутнасці канкрэтных канцэпцый і непрафесіяналізме, адмоўна адбіваецца на агульным прэстыжы Беларусі за межамі краіны, спакоі і развіцці ўнутры краіны.

Крызіс у адукацыі – прадвеснік агульнага завалу ў краіне. Ці зразумее гэта неадукаваны чыноўнік?

# Адбыўся круглы стол "Рэформа адукацыі: пагрозы і перспектывы"

*(Пачатак на стар. 1)*

прыкладам, юрыстаў і міліцыянтаў пры адсутнасці прававой прасторы ў дзяржаве. І так у любой галіне. (Добры "софт", дрэнны "хард"). Цяперашняя рэформа прадугледжвае паніжэнне узроўня акадэмічных ведаў, але не дае альтэрнатывы вузкапрофільнай перадпрафесійнай практыкаарыентаванай падрыхтоўкі.

- Гуманітарная адукацыя пакладзена на ахвярнік. З іншага боку нельга рыхтаваць армію філосафаў. Ніводзін прафесар літаратуры, філасофіі, псіхалогіі не прачытае за сваё жыццё кніг, якія напісал яго папярэднікі.

2 шляхі:

Першы - шлях Рубінава:Хто хоча, хай самастойна здабывае гуманітаныя веды. Другі шлях - – вучыць у школе, як здабываць гуманітарныя веды і не толькі гуманітарныя. Трэба навучыць школьніка набытыя веды ўкладываць у сістэму. Трэба вучыць рабіць выбар. Г.зн уводзіць навучанне кампетэнцыям.

**Прапановы да аўтараў рэформы**

- Школа павінна вучыць

1) Мовам – тут паніжаць узровень нельга;

2) Інтэрпрэтацыі тэкстаў (у сучасным варыянце трэба вучыць школьнікаў інтэрпрэтацыі не толькі тэкстаў, але і твораў мастацтва, фільмаў, кліпаў, медыя- і інфармацыйных прадуктаў). Гэта будзе спрыяць фармаванню светапогляду. Трэба займацца герменэўтыкай.

- Аб'яднанне сусветнай і беларускай гісторыі ў адзін прадмет патрабуе папярэдняга стварэння сістэмнага гістарычнага курсу, дзе б гісторыя Беларусі была ўпісана ў у агульную гісторыю Еўропы і свету.

**Што рабіць настаўніку?**

- Сітуацыя спрыяе вымыванню прафесіяналаў асабліва сярод дырэктароў і нам. дырэктароў школаў. Перад тым, як сыйсці са школы, падумайце, хто прыдзе на вашае месца. Калі пакінуць вучням 800 гадзінаў у год без добрых настаўнікаў – хто з іх вырасце?!

# Заява асамблеі “Беларускамоўнае навучанне і выхаванне: нацыянальная бяспека і незалежнасць краіны”

***прынятая 23 мая 2008 года грамадскімі аб’яднаннямі “Таварыства беларускай школы” і “Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны”***

*Абмеркаваўшы стан навучання і выхавання ў адукацыйных установах краіны, прадстаўнікі дзвюх арганізацый канстатуюць, што апошнія 12 гадоў установы адукацыі краіны вымушаны працаваць ва ўмовах крайняй нестабільнасці.*

*1. Неапраўдана часта змяняюцца вучэбныя планы, праграмы, падручнікі. У канцы 90-х гадоў падставай для замены дапаможнікаў была наяўнасць у іх гістарычнага сімвалу, як, напрыклад, у “Буквары”. Цяпер выключаюцца з праграмаў творы таленавітых, у тым ліку народных, пісьменнікаў. Прапануюць скасаваць – таксама шляхам неапраўданага злучэння ў адну – навучальныя дысцыпліны. Перадусім таму рэфармаванню найперш паддаюцца дысцыпліны, якія фармуюць патрыятызм, грамадзянскія пачуцці, маральныя якасці, эстэтычны густ: літаратура, гісторыя, мастацкая культура.*

*2. Дзеля г.зв. аптымізацыі зачыняюцца школы, ліцэі, ВНУ, сярод якіх установы, якія складалі гонар беларускай адукацыі, – Беларускі гуманітарны ліцэй з яго рэгіянальнымі філіямі і Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт.*

*3. Неабгрунтаваная, амаль штогадовая змена правілаў прыёму ў ВНУ і размеркавання выпускнікоў стварае сітуацыю нераўнапраўя для абітурыентаў і выпускнікоў вышэйшай школы розных гадоў, прыводзіць да зніжэння якасці адбору будучых спецыялістаў, стварае нервовую атмасферу ў грамадстве ў цэлым.*

*4. Беларуская мова як мова навучання і выхавання, а таксама як прадмет надалей маргіналізуецца, дыскрымінуецца. Ствараюцца ўмовы для паслядоўнага скарачэння колькасці вучняў, якія займаюцца па-беларуску.*

*5. Пазбаўленне навучэнцкай моладзі, пачынаючы з малодшага школьнага ўзросту, ільготаў на праезд сур’ёзна ўплывае на дабрабыт іхніх сем’яў, стварае дадатковае сацыяльнае напружанне. Да гэтай праблемы істотна дадаецца недахоп студэнцкіх інтэрнатаў.*

*6. Школы і ўніверсітэты пачынаюць выкарыстоўвацца як інструмент палітычнага ўціску. З ВНУ па надуманых прычынах нават выключаюць найбольш таленавітых і творчых студэнтаў з патрыятычнымі і дэмакратычнымі перакананнямі (Акадэмія кіравання, БДЭУ, ГДУ, МДЛУ, БДУ і інш.). Не на дэмакратызацыю і асобу працуе навязаная кантрактная сістэма, псеўдаграмадскія арганізацыі ў адукацыйных установах.*

*Пра глыбокі крызіс у адукацыйнай сферы сведчыць неадпаведнасць цяперашняй беларускай адукацыі еўрапейскім стандартам, яе недастатковая фінансавая падтрымка і жорсткі ідэалагічны ўціск. Сотні прафесіяналаў з’язджаюць на працу за мяжу. Моладзевая эміграцыя набыла самыя маштабныя памеры.*

*Перад новым наступам на беларускую школу, які плануецца ў выглядзе чарговай псеўдарэформы, у абарону прафесіяналізму і педагагічнай кампетэнтнасці выступілі настаўнікі-пераможцы рэспубліканскіх конкурсаў розных гадоў, былыя работнікі Міністэрства адукацыі, найбольш свядомыя і знаныя ў гэтай сферы спецыялісты. Педагагічная і бацькоўская грамадскасць адчувае страх і трывогу з-за пагрозы рэпрэсіяў.*

*Непрадбачлівыя ініцыятывы супрацоўнікаў Міністэрства адукацыі і навяўленых спецыялістаў у кіраўніцтве краіны адбіваюцца на прэстыжы Беларусі за межамі краіны, на грамадзянскім спакоі і перспектывах устойлівага развіцця дзяржавы. Неабходная сапраўдная рэформа, скіраваная на збліжэнне з еўрапейскімі стандартамі, на выхаванне адукаваных і карысных сваёй краіне грамадзянаў і патрыётаў, але яна нават не планавалася. Пытанне насамрэч не ў працягласці навучання, а ў стаўленні да нацыянальнай сістэмы адукацыі.*

***Асамблея настойліва рэкамендуе:***

- *Каб унікнуць паспешлівасці і новых памылак, Міністэрству адукацыі на працягу года правесці работу для асэнсавання і аналізу сітуацыі, навуковага і эканамічнага абгрунтавання і стварэння новай канцэпцыі развіцця беларускай адукацыі, угрунтаванай на нацыянальным і сусветным досведзе.*
- *Разумеючы найважнейшае значэнне нацыянальна-культурных каштоўнасцяў, беларускай мовы, гуманітарных прадметаў у фармаванні грамадзянскай супольнасці, адказнай за лёс краіны, у выхаванні высокіх чалавечых якасцяў, беларускага патрыятызму, адпаведна прадставіць у школьных вучэбных планах “Беларускую мову”, “Беларускую літаратуру”, “Гісторыю Беларусі”, “Айчынную і сусветную мастацкую культуру”, а таксама аднавіць экзамен па беларускай літаратуры.*
- *Усведамляючы, што людзі нараджаюцца з неаднолькавымі магчымасцямі і задаткамі, пазбягаць непедагагічнага прынцыпу “адзін капыл” пры стварэнні канцэпцыі размеркавання сістэмы класаў і тыпаў устаноў (паглыбленыя, профільныя; гімназіі, ліцэі і г.д.), зберагчы створаную і апрабаваную сетку гімназіяў, ліцэяў, ліцэйскіх класаў.*
- *З мэтай набліжэння нашай адукацыі да сусветных нормаў, росту яе прэстыжнасці ў грамадстве распрацаваць захады дзеля дапасавання сістэмы айчыннай адукацыі да Балонскага працэсу.*
- *Забяспечыць належны кантроль за выкананнем канстытуцыйных нормаў выкарыстання беларускай мовы ва ўстановах рэспублікі, Пастановы Міністэрства адукацыі ад 27 жніўня 2002 г. “Праграма дадатковых мер па пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы ў сістэме адукацыі”.*

*Асамблея выступае з ініцыятывай правядзення сёлета Бацькоўскага Форуму з удзелам прадстаўнікоў бацькоўскіх радаў і бацькоўскіх камітэтаў школ краіны з мэтай абмеркавання планаванай рэформы адукацыі.*

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта ***Nastaunik.info***
Адрас для допісаў: ***nastaunik.info@gmail.com***
Наклад ***200*** асобнікаў

# Абвесткі, конкурсы, праграмы

**ЛНабор у Беларускі Калегіюм**

Запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У выключных выпадках прымаюцца студэнты малодшых курсаў. Навучэнцамі БК могуць быць тыя, хто стала альбо на час навучання пражывае ў Менску. Навучанне ў БК — бясплатнае. Запіс на сумоўе па 29 верасня 2008 году.

Навучальныя праграмы БК арыентаваныя на выкладанне найноўшых фрагментаў сучасных ведаў і не дублююць існуючыя праграмы дзяржаўных і недзяржаўных універсітэтаў. Сертыфікат Калегіюму не замяняе дыплём аб вышэйшай адукацыі.

Абавязковай умовай запрашэння на сумоўе (за выключэннем спецыялізацыі «Найноўшая гісторыя») з’яўляецца падача да пазначанай вышэй даты творчага заданьня (спэцыялізацыя «Журналістыка») і аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў (спецыялізацыі «Журналістыка», «Філасофія/літаратура»).

Таксама аплíканты ўсіх спецыялізацыяў мусяць запоўніць уступную анкету, выкладзеную на сайце Беларускага Калегіюму, дзе можна азнаёміцца з праграмамі курсаў і выкладчыкамі. Пачатак заняткаў запланаваны на 6 кастрычніка 2008 года.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэл. +37529 276 27 15 (МТС), +37529 679 26 82 (Velcom) з 14.00 да 18.00 (акрамя суботы і нядзелі) ці праз kalehium@gmail.com.

**.Сайт DZIACINSTVA.NET**

*У сеціве з’явіўся новы сайт для бацькоў і дашкольных педагогаў.*

*Нашыя суайчыннікі, якія пакінулі Радзіму ў пошуках лепшай долі, стварылі сайт “Дзяцінства”, які назвалі віртуальнай беларускай школкай. Сайт утрымлівае беларускія дзіцячыя песні, кніжкі і дыяфільмы. Сайтам і нядзельнай школкай для беларускіх дзетак займаецца ў асноўным сям’я Галіны і Андруся Падлескіх.*

*Нагадваем, што расціць беларусаў дапамогуць і наступныя інтэрнэт рэсурсы.: партал Нашыя дзеткі, Казачнік, «З рога ўсяго многа«.*

**Выхавацелька для беларускамоўных дзетак**

*Беларускамоўным дзеткам з мінскага 314-га садка (вул. Багдановіча, 68 А) тэрмінова патрэбныя выхавацелька і няня. Тэл: 334-25-61 (гарадскі, адміністрацыя), 676-89-88 (мабільны, бацькоўскі камітэт).*